ставляется важной закономерностью совместной встречаемости слов. В качестве факторов, способствующих использованию существительных в составных наименованиях, выступают такие их свойства, как неисчисляемость, собирательность и конкретность, на что указывает наличие номинативных сочетаний типа *address overflow, computer circuitry, card sorter*, конституентами которых выступают существительные, обладающие указанными свойствами. Напротив, отнесенность слова к классам исчисляемых, единичных и абстрактных имен выступает в качестве запрета на совместную встречаемость существительных. Оппозиция категорий одушевленности/неодушевленности оказывается нерелевантной для сочетаемости имен в рассматриваемой модели.

Дальнейшее развитие данное исследование может получить как за счет привлечения к анализу других семантических признаков, так и путем использования многомерных методов анализа.

*С.В. Кухта*
*Белорусский государственный экономический университет (г. Минск)*

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІНГВІСТЫКА АБ СКЛАДАНЫХ СЛОВАХ У РОДНАЙ МОВЕ

Па падліках, у апошнія недзе трыццаць гадоў лексіка сучасных усходнеславянскіх моў папаўняецца пераважна за кошт складанняў. У наш час можна гаварыць пра своеасаблівы «бум» складаных слоў, іх налічваюцца дзесяткі тысяч. Калі ж сюды ўключыць абрэвіятуры, а таксама аўтарскія неалагізмы, спецыяльныя тэрміны, то колькасць іх узрасце да соцень тысяч.

Складаныя словы як асобы разрад вытворных дастаткова шырока вывучаліся на матэрыяле розных усходнеславянскіх моў, у тым ліку і ў беларускай. Аднак даследчыкі абмяжоўваліся матэрыялам пераважна сучаснага словаўтварэння. Гісторыя станаўлення і развіцця словаскладання ва ўсходнеславянскіх мовах даследавана недастаткова. Асабліва гэта тычыцца генезісу словаскладання ў беларускай мове, дзе зроблены толькі першыя спробы высвятлення прыроды складанага слова, асэнсавання месца і ролі кампазіцыі ў агульным працэсе гістарычнага развіцця лексічнай сістэмы мовы беларускага народа.

Паасобныя заўвагі аб паходжанні складаных слоў ва ўсходнеславянскай мове можна знайсці ў нешматлікіх працах лінгвістаў.

У значна большай ступені даследаваны складанні сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Сярод прац на гэту тэму вылучаюцца кандыдацкія дысертацыі В. Гнеўка, З. Краўчанка, Л. Гадуйка.

У кандыдацкай дысертацыі В. Гнеўка «Складаныя прыметнікі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» дастаткова поўна ахарактарызаваны словаўтваральныя тыпы складаных прыметнікаў у сучаснай літаратурнай мове, прааналізаваны найбольш важныя асаблівасці іх функцыянавання.

Аналізу складаных назоўнікаў у беларускай мовы прысвечана дысертацыя З. Краўчанка «Сложные имена существительные в белорусском языке». Аўтар даволі падрабязна даследуе розныя погляды лінгвістаў на сутнасць складанага слова, аналізуе таксама і складанаскарочаныя словы як новы разрад лексічных сродкаў сучаснай беларускай мовы.

Словаўтваральнай актыўнасці складаных слоў у беларускай літаратурнай мове прысвечана кандыдацкая дысертацыя Л. Гадуйка «Словаўтваральныя гнёзды складанасуфіксальных назоўнікаў з дзеяслоўным кампанентам у беларускай і рускай мовах».

Вывучэнню спосабаў складання прыметнікаў у сучаснай беларускай мове прысвечаны вялікі артыкул Б. Касоўскага «З назіранняў над складанымі прыметнікамі у сучаснай беларускай літаратурнай мове». Найбольш поўна ў артыкуле прааналізаваны структурна-семантычныя і структурна-сінтаксічныя тыпы падпарадкавальнага спосабу ўтварэння складаных прыметнікаў.

Вывучэнню складаных слоў на матэрыяле сучаснай беларускай літаратурнай мовы прысвечаны паасобныя артыкулы І. Акулава «Іншамоўныя словаўтваральныя фарманты ў беларускай мове», М. Васілеўскага «Складаныя дзеясловы», Т. Гераскінай «Сложные прилагательные с причастным компонентом в качестве второй части слова в русском и белорусском языках», Л. Сямешкі «Асновы іншамоўнага паходжання ў складзе кампозіт беларускай мовы савецкага часу», С. Шадыкі «Прадуктыўныя і непрадуктыўныя тыпы складаных назоўнікаў сучаснай беларускай мовы» і іншыя.

Некалькі асобна ў беларускай лінгвістычнай літаратуры стаіць артыкул П. Сцяцко «Семантычная і словаўтваральная структура складаных назоўнікаў гутарковай мовы», які істотна пашырае нашы ўяўленні аб складаных словах у беларускай мове.

Падсумоўваючы сціслы агляд беларускай лінгвістычнай літаратуры па тэме ўтварэння складаных слоў, нельга не адзначыць, што ў навуковы ўжытак быў уведзены значны фактычны матэрыял і праведзена яго фармальная характарыстыка. Шкада, што даследчыкі абмяжоўваліся фактамі пераважна сучаснай беларускай літаратурнай мовы, толькі зрэдку і вельмі асцярожна праводзячы пэўныя паралелі з гістарычнага мінулага беларускай мовы.

*А.С. Лавникевич*
*Минский государственный*
*лингвистический университет (г. Минск)*

## К ВОПРОСУ О РОЛЕВЫХ ОТНОШЕНИЯХ КОММУНИКАНТОВ В ДИАЛОГИЧЕСКОМ ВЗАИМОДЕЙСТВИИ

При изучении языка с позиции коммуникативного подхода на повестку ставится проблема социального и речевого взаимодействия людей, воплощением которого является диалог. В рамках данного подхода диалогическое взаимодействие рассматривается как комплексный вид дея-

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by